ваний белорусской культуры, языка и литературы. – Минск, 2012. – 31 с.

3. *Саратовская, Н. Н.* Белорусский плакат периода хрущевской «оттепели» [Электронный ресурс] / Н. Н. Саратовская // Беларускі плакат. – Режим доступа: https://plakat.unid.by/blogosphera/belorusskiy-plakat-perioda-hrushchevskoy-ottepeli. – Дата доступа: 11.03.2022.

4. *Саратовская, Н. Н.* Плакат как объект искусствоведческого исследования [Электронный ресурс] / Н. Н. Саратовская // Беларускі плакат. – Режим доступа: https://plakat.unid.by/blogosphera/plakat-kak-obekt-iskusstvovedcheskogo-issledovaniya. – Дата доступа: 11.03.2022.

5. *Саратовская, Н. Н.* Современный белорусский плакат [Электронный ресурс] / Н. Н. Саратовская // Беларускі плакат. – Режим доступа: https://plakat.unid.by/blogosphera/sovremennyy-belorusskiy-plakat-1990-2000. – Дата доступа: 12.03.2022.

6. *Солодовникова, Т. В.* Содержательные характеристики белорусского плаката как доминирующей формы рекламной коммуникации на территории Беларуси с 1914 по 1990 г. / Т. В. Солодовникова // Труды БГТУ, Сер. 4, Принт- и медиатехнологии. – 2021. – № 2 (249). – С. 147–152.

7. *Сурский, Е. Д.* Своевременный белорусский плакат / Е. Д. Сурский // Pro дизайн. – 2004. – № 12. – С. 34–35.

**К. А. Скур'ят,** *аспірант.*
Навуковы кіраўнік – **А. М. Нароўская,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт*

## ЭТНАГРАФІЧНЫЯ ЭКСПАЗІЦЫІ БЕЛАРУСКІХ МУЗЕЯЎ ЯК АБ'ЕКТ ТУРЫСТЫЧНАГА ПАКАЗУ

На сучасным этапе турызм з'яўляецца не толькі адной з буйных галін эканомікі, але і найбольш дзеясным спосабам знаёмства з культурай свайго і іншых народаў. У эпоху пандэміі COVID-19 значнасць набывае ўнутраны турызм, адным з папулярных напрамкаў якога з'яўляецца этнаграфічны турызм. Багатая этнакультурная спадчына, якая захавалася ў рэгіёнах Рэспублікі Беларусь, дае шырокія магчымасці для яго развіцця.

Павышаную цікавасць для турыстаў уяўляюць этнаграфічныя музеі гістарычнага профілю, якія дакументуюць этнагенэз народаў і іншых грамадскіх супольнасцей, іх побыт і культуру праз збіранне, захаванне, вывучэнне і папулярызацыю этнаграфічных калекцый. Абсалютная большасць краязнаўчых музеяў

(70 %) маюць у сваіх экспазіцыях раздзелы, якія прадстаўляюць народную культуру [2, с.14].

На сённяшні дзень існуе дастатковая колькасць навуковай, навукова-папулярнай, публіцыстычнай літаратуры па выкарыстанні этнаграфічнай спадчыны Рэспублікі Беларусь у сферы турызму.

Пытанні папулярызацыі этнакультурнай спадчыны і праблема яе выкарыстання ў сферы турызму абмеркаваны ў працах такіх даследчыкаў, як Г. І. Каспяровіч, А. І. Лакотка [14; 15]. Этнаграфічная разнастайнасць традыцыйнай культуры беларусаў і магчымасці выкарыстання яе ў сферы турызму былі разгледжаны ў артыкулах В. Л. Блішч, О. А. Мячкоўскай, В. А. Пранабіс, В. М. Смаляровай [2; 11–13]. Паводле аналізу тураў, якія прапануюцца беларускімі і замежнымі турыстычнымі фірмамі, найбольш папулярным дзяржаўным этнаграфічным музеем на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з’яўляецца Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту ў вёсцы Азярцо Мінскай вобласці [4].

Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту быў заснаваны ў 1976 г. Музей з’яўляецца адзіным скансэнам на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, які захоўвае і дэманструе помнікі беларускага драўлянага дойлідства пад адкрытым небам у прыродным асяроддзі. У склад 30 музейных калекцый уваходзіць 23 975 музейных прадметаў, якія ўсебакова асвятляюць жыццё і побыт нашых продкаў. Экспазіцыя музея прадстаўлена 35 творамі народнага драўлянага дойлідства [1].

На сённяшні дзень у музеі функцыянуюць 3 сектары: «Цэнтральная Беларусь», «Падняпроўе» і «Паазер’е». Кожны з іх уяўляе фрагмент тыповага паселішча канца XIX – пачатку XX ст. Прыродна-ландшафтныя асаблівасці тэрыторыі, на якой размяшчаецца музей, і наяўнасць на ёй гістарычных помнікаў даюць магчымасць выкарыстоўваць натуральныя фрагменты прыродна-геаграфічнага асяроддзя, адпаведныя ўсім рэгіёнам Беларусі. Акрамя таго, у музеі маюцца багатыя матэрыялы, якія характарызуюць матэрыяльную культуру другой паловы XIX – пачатку XX ст. [7].

Наведвальнікам прапануецца багаты асартымент формаў экскурсійнага абслугоўвання. Гэта і традыцыйныя экскурсіі

працягласцю ад 1,5 да 3 гадзін, і экскурсіі з інтэрактыўнымі элементамі (традыцыйнымі строямі, народнай музыкай, песнямі і забавамі), і абрадавыя мерапрыемствы («Каляды», «Пшанічны каласок», «Беларускае вяселле», «Камаедзіца»), супрацоўнікамі музея ладзяцца лекцыі для школьнікаў і дарослых, а таксама праводзяцца музейныя заняткі на этнаграфічную тэматыку.

Дакладнае аднаўленне народнай архітэктуры ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту звярнула на сябе ўвагу не толькі турыстаў, але і дзеячаў культуры суседніх краін. У першую чаргу гэта датычыцца кінематаграфістаў. Тут здымаліся такія фільмы, як «В августе 44-го» (2001), «Анастасия Слуцкая» (2003), «Поп» (2009) і г. д. Гэта павышае інтарэс да музея сярод аматараў кінатурызму [9].

Наступным значным этнаграфічным музеем з'яўляецца гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе». Пад аховай запаведніка знаходзяцца 113 га старажытнай часткі горада, на якой размяшчаюцца такія гістарычныя каштоўнасці, як гарадзішча «Замэчак» (помнік археалогіі X–XII стст.), гарадзішча «Вал» з былым кальвінісцкім зборам (гісторыка-культурны помнік XI–XVII стст.), курганныя могільнікі X–XI стст., Музей «Дзот», Дзіцячы музей міфалогіі, касцёл Нараджэння Найсвяцейшай Дзевы Марыі (другая палова XVIII ст.) [5].

У экспазіцыйна-выставачным комплексе музея-запаведніка дзейнічаюць пастаянныя этнаграфічныя выставы: «Музыка вячорак», прысвечаная дзейнасці народных вясельных ансамбляў (гуртоў), і «Гандлёвая крама канца XIX – пачатку XX стагоддзя» (адкрыта ў 2018 г.), якая прадстаўляе быт гандляроў канца XIX – пачатку XX ст. [10].

Цікавасць уяўляе ўваходзячы ў склад музея этнаграфічны комплекс «Млын», які складаецца з чатырох пабудоў: паравога млыну пачатку XX ст. з захаваўшымся абсталяваннем, «кузні» (афармленай згодна часу пабудовы), «хаты завозніка» (своеасаблівай мястэчковай гасцініцы) і свірана [8].

Афармленне музейнага комплексу стварае праекцыю на быт мястэчкоўцаў пачатку XX ст., а таму комплекс добра падыходзіць для пазнавальнага і духоўнага адпачынку турыстаў. Больш таго, заслаўскі млын – адзіны паравы млын, які сёння

захаваўся на беларускіх землях. Па папярэдняй дамоўленасці супрацоўнікі музея арганізуюць тэатралізаваную экскурсію. Таксама на аб’ектах музея-запаведніка традыцыйна праходзяць прафесійныя і аматарскія фотасесіі, тут здымаюцца эпізоды для дакументальных і мастацкіх фільмаў [9].

Аднак неабходна адзначыць, што падобныя варыянты, адарваныя ад рэгіянальнай і лакальнай спецыфікі, заключаюць у сабе нейкі характэрны, стэрэатыпны набор кампанентаў традыцыйнай культуры, што вядзе да фарміравання скажонага ўяўлення аб этнічных традыцыях. Турыстычнае выкарыстанне традыцыйнай культуры, на думку аўтара, павінна адлюстроўваць яе рэгіянальныя і лакальныя асаблівасці.

Цікавым прыкладам у гэтым плане з яўляецца Веткаўскі музей народнай творчасці, створаны ў 1978 г. на аснове асабістай калекцыі Фёдара Шклярава – выхадца з мясцовага стараверскага роду, самадзейнага мастака і калекцыянера даўніны. У экспазіцыі музея знаходзіцца звыш 10 тыс. аб’ектаў, якія прадстаўляюць гісторыю і культуру стараверскай і праваслаўнай беларускай вёскі [3].

У музеі таксама размешчаны экспанаты стараверскага мастацкага ліцця, калекцыі мясцовых мастацкіх рамёстваў і промыслаў XVII – пачатку XX ст. У экспазіцыі прадстаўлены залатое шыццё, шыццё бісерам і пазалочаная разьба па дрэве (кіёты), кавальскі метал, металічныя аклады на абразы і кнігі. Адна з найбуйнейшых калекцый тканых ручнікоў – тры з паловай тысячы ўзораў.

Сёння ў Веткаўскім музеі праходзяць экскурсіі (ёсць электронны гід на чатырох мовах), вячоркі, майстар-класы (ткацтва, роспіс велікодных яек, тэматычныя выставы), а ў зале «Жывое рамяство» госці могуць пазнаёміцца з традыцыямі і сакрэтамі беларускага ткацтва.

Другім прыкладам музею лакальнай этнаграфіі з’яўляецца Музей этнаграфіі ў Магілеве, філіял Магілеўскага абласнога краязнаўчага музея імя Еудакіма Раманава. Музей мае дзве экспазіцыйныя і адну выставачную залы. Першая экспазіцыя мае назву «Кругаварот зямлі роднай». У яе аснову пакладзены асноўныя абрадавыя святы беларусаў. Экспазіцыйныя прадметы (ткацтва, керамічныя вырабы) дэманструюць асаблівасці

народнай культуры розных частак Магілёўскай вобласці. Матэрыялы цэнтральных раёнаў прадстаўляюць вясновыя святы, паўночных – летнія, усходніх – восеньскія [6].

У музеі можна ўбачыць вясельны абрад, сапраўдныя народныя касцюмы, кераміку розных раёнаў Магілёўскай вобласці, узоры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і інш. Скласці поўнае ўяўленне пра побыт Магілёўскага Падняпроўя дапамагаюць унікальныя фотаздымкі, зробленыя з негатываў канца XIX ст.

Іншая экспазіцыя «Магілеў губернскі» прысвечана побыту гарадскіх жыхароў пачатку XX ст. На прыкладзе адной вуліцы прадэманстраваны лад жыцця розных слаёў беларускага грамадства. Цікавасць уяўляюць адноўленыя інтэр’еры з атрыбутамі старога часу – сапраўднымі прадметамі хатняга начыння, мэблі, прадметаў культу і ваеннай амуніцыі, якія ствараюць атмасферу жыцця губернскага горада пачатку XX ст. Таксама ў музеі ладзяцца тэматычныя выставы работ народных майстроў [6].

Асноўная інфармацыйная дзейнасць этнаграфічных музеяў дэманструецца ў сацыяльных стужках сеці Інтэрнэт, якія з’яўляюцца адной з асноўных крыніц інфармацыі для сучаснага грамадства. Гэта дазваляе актыўна далучаць новую аўдыторыю і ствараць новыя праекты.

Такім чынам, разгледзеўшы экспазіцыі чатырох музеяў, мы можам зрабіць выснову, што беларускія этнаграфічныя музеі валодаюць дастатковым патэнцыялам для развіцця этнаграфічнага турызму на тэрыторыі нашай краіны. У экспазіцыях музеяў прадстаўлены як помнікі драўлянага дойлідства другой паловы XIX – пачатку XX ст., так і прадметы побыту. Экспазіцыі музеяў дазваляюць турыстам пазнаёміцца з асаблівасцямі этнаграфічнай спадчыны рэгіёнаў краіны. Наведвальнікам таксама прапануюцца разнастайныя формы экскурсій з інтэрактыўнымі элементам і цікавыя абрадавыя мерапрыемствы.


*1.* Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://etna.by. – Дата доступу: 03.04.2012.

*2. Блищ, В. Л.* Туристские возможности музеев Беларуси (аналитический обзор по материалам анкетирования) / В. Л. Блищ // Личность –

слово – социум : материалы VII Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 11–12 апр. 2007 г. : сб. : в 3 ч. / отв. ред. Т. А. Фалалеева. – Минск, 2007. – Ч. 2. – С. 14–17.

*3.* Ветковский музей старообрядчества и белорусских традиций им. Ф. Г. Шклярова [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://museums.by/muzei/muzei-g-gomelya-i gomelskoy-oblasti/vetkovskiy-muzey-staroobryadchestva-i-belorusskikh-traditsiy. – Дата доступа: 15.12.2015.

*4.* Все экскурсии по Беларуси: этнографические [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ekskursii.by/ Vse_ekskursii_ belarusi=8063_Etnograficheskie/ – Дата доступа: 21.09.2017.

*5.* Историко-культурный музей-заповедник «Заславль» // Заслаўе [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.zaslaue.by/. – Дата доступа: 04.04.2012

*6.* Могилевский областной краеведческий музей имени Е. Р. Романова [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://mogilewmuseum.by /yekspazicyi. – Дата доступа: 18.06.2014.

*7.* Этнографические музеи Беларуси [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.belarus.by/ru/travel/ethno-tourism/ethnographic-museums. – Дата доступа: 13.05.2013.

*8.* Этнографический музей «Млын» в Заславле [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://poznamka.ru/belarus/muzej-mlyn-v-zaslavle. – Дата доступа: 31.10.2014.

*9.* Популярные туристические места Беларуси, которые часто мелькают в кино [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.sb.by /articles/snimay-v-belarusi.html. – Дата доступа: 10.11.2020.

*10.* Малый музей и большая любовь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://belayarus.by/news/novosti-proektov/kray-v-kotorom-ya-zhivu/malyy-muzey-i-bolshaya-lyubov-/. – Дата доступа: 11.09.2020.

*11. Мечковская, О. А.* Фольклорно-этнографический потенциал Беларуси как фактор активизации въездного туризма / О. А. Мечковская // I Междунар. конф. по сотрудничеству и формированию согласованной политики в вопросах развития культурно-познавательного туризма на пространстве СНГ : сб. науч. ст. – М., 2011. – С. 110–115.

*12. Пранабіс, В. А.* Фестывалі традыцыйных беларускіх рамёстваў як аб’екты турызму / В. А. Пранабіс // Материалы XII Междунар. науч.-практ. конф. молодых исследователей, Барановичи, 19–20 мая 2016 г. : в 3 ч. / М-во образования Респ. Беларусь, Барановичский гос. ун-т, студ. науч. о-во БарГУ; редкол.: А. В. Никишова (гл. ред.) [и др.]. – Барановичи : РИО БарГУ, 2016. – Ч. 3. – 229 с.

*13. Смолярова, В. М.* Структурные особенности ресурсного потенциала фольклорноэтнографического туризма в Беларуси [Электронный

ресурс] / В. М. Смолярова. – Режим доступа: http://tourlib.net/statti_tourism/smolyarova.htm. – Дата доступа: 30.05.2015.

*14. Касперович, Г. И.* Национальный парк «Нарочанский» в выявлении, сохранении и популяризации этнокультурного наследия / Г. И. Касперович // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. арт. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2009. – Вып. 6. – С. 580–587.

*15. Локотко, А. И.* Историко-культурные ландшафты Беларуси / А. И. Локотко ; НАН Беларуси, Ин-т этнографии и фольклора. – Минск : Белорус. наука, 2006. – 470 с.

**Е. А. Стрижнева,** *аспирант.*
Научный руководитель – **Ю. Н. Галковская,**
*кандидат педагогических наук, доцент*

# НАУЧНО-ИССЛЕДОВАТЕЛЬСКИЕ КОМПЕТЕНЦИИ СТУДЕНТОВ: СУЩНОСТЬ ПОНЯТИЯ

Качество научно-исследовательской деятельности студентов в значительной степени определяется уровнем сформированности у них научно-исследовательских компетенций. В организацию и сопровождение научно-исследовательской работы студентов (НИРС) вовлечены, прежде всего, факультеты, кафедры, библиотека университета. Однако актуальной проблемой остается целенаправленное развитие и формирование у студентов специальных знаний и умений, связанных с научным поиском, подготовкой публикаций и выступлений на научных мероприятиях. Студенты имеют значительный потенциал для интеграции в научно-исследовательские инициативы.

Научно-исследовательские компетенции рассматривают преимущественно в сфере педагогики и образования белорусские (А. В. Макаров, В. В. Рабцевич, Е. В. Тихоненко и др.), российские (И. А. Зимняя, Л. Г. Назарьева, И. Н. Романова, А. В. Хуторской, Е. Э. Шендерей, Н. В. Шестак, В. Г. Шляпина и др.), зарубежные (К. Э. Аскарова, А. Балтруна, А. И. Бурибаева, К. Палермо и др.) исследователи. Формирование исследовательских компетенций и проблемы содействия научному поиску в условиях библиотек изучают российские специалисты О. В. Дворовенко и Г. И. Сбитнева, поддержку научных ис-